# РАЁННЫЯ ГАЗЕТЫ Ў ФОНДАХ НББ

***Нясмелава Тацяна Мікалаеўна**, галоўны бібліятэкар аддзела захоўвання спецыялізаваных фондаў НББ*

Газеты – неад’емная частка духоўнага жыцця народа. Яна, як летапісец гісторыі, задавальняе інтарэсы карыстальнікаў да бягучых падзей, набывае новыя якасці, становячыся помнікам гісторыі і культуры, важнай крыніцай інфармацыі.

Сёння ў інфармацыйнай прасторы Рэспублікі Беларусь зарэгістравана звыш 1300 сродкаў масавай інфармацыі, у тым ліку больш за 850 назваў газет. Газетныя фонды займаюць значнае месца ў інфармацыйных рэсурсах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ). Важнай састаўной часткай нацыянальнага дакумента з’яўляюцца раённыя газеты Рэспублікі Беларусь. Яны служаць базай для рэгіянальных даследаванняў, з’яўляюцца першакрыніцай звестак аб падзеях, фактах, людзях раёна, яго гісторыі, выхоўваюць любоў да роднага краю.

Фонд раённых газет НББ унікальны, бо ні ў адной бібліятэцы рэспублікі, ні за яе межамі не сабрана больш поўная калекцыя дадзенага віду выданняў. Ён налічвае 423 назвы, што складае 7722 гадавыя камплекты. Бягучы фонд – 133 назвы. Калекцыя раённых выданняў пачынаецца з газеты “Камуніст” Бабруйскага раёна за 1924 г.

Мною быў праведзены шэраг даследаванняў па вывучэнню становішча фонду раённых газет Ляхавіцкай ЦБС Брэсцкай вобласці, Петрыкаўскай ЦБС Гомельскай вобласці. Выкананая работа паказала, што ў сувязі з недахопам плошчаў сховішч, няякасным пераплётам тэрмін захоўвання раённых газет складае 5 гадоў у рассыпным выглядзе. Абласныя бібліятэкі захоўваюць раённыя газеты толькі 10 гадоў.

Структурна фонд раённых дакументаў НББ падраздзяляецца па храналагічнаму прынцыпу (газеты даваеннага, ваеннага, пасляваеннага і сучаснага перыядаў). Такі падыход забяспечвае надзейную захаванасць фонду і пазбаўляе газеты ад частага перасоўвання.

У асобны рад выдзелены газеты ліквідаваных раёнаў. Такую назву атрымалі выданні, якія спынілі свой выхад у свет у 50–60-я гг. у сувязі з аб’яднаннем некалькіх раённых цэнтраў у адзін. Газеты дадзенага тыпу прадстаўлены ў сховішчы з 30-х па 60-я гады. Усяго – 86 назваў, 880 гадавых камплектаў. Гэта такія выданні, як “Сцяг Леніна” Свацілаўскага раёна, “Калгасны шлях” Прапойскага раёна, “Камунар” Заслаўскага раёна і іншыя. У апошні час цікавасць карыстальнікаў да гэтых газет не змяншаецца, што сведчыць аб іх асобай значнасці

У фонд раённых газет увайшлі штотыднёвікі асобных рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь (12 назваў), сярод якіх: “Інфакур’ер” (Слуцк, Салігорск, Старыя Дарогі, Капыль, Любань з 2001 па 2005 гады), “Транзіт” (Крупкі, Барысаў, Жодзіна, Смалявічы за 2002 г.), газеты, выдадзеныя асобнымі арганізацыямі раёнаў, напрыклад: “Беражніца” – выданне Пастаўскай

раённай арганізацыі ТБМ імя Скарыны з 2000 па 2002 г., спецвыпускі, такія, як “Скарбонка” – спецвыпуск газеты “Слова працы” Капыльскага раёна за 2005 год, дадаткі да асноўных раённых газет, напрыклад, дадатак да “Крупскага весніка” Крупскага раёна “По крупицам” за 2003–2005 гг., “Контакт” – дадатак да газеты “Новы дзень” Жлобінскага раёна за 1994, 1995, 2003–2005 гг.

Самыя каштоўныя выданні – гэта газеты даваеннага і ваеннага перыядаў. Сярод іх – “Сцяг Леніна” Бярэзінскага раёна (1932–1939 гг.), “Сталінская праўда” Веткаўскага раёна (1931–1938 гг.). На вялікі жаль, за гэтыя гады камплекты газет няпоўныя, іх недахоп звязаны з цяжкасцямі камплектавання ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Выяўленне і ліквідаванне прабелаў – асноўная задача работы на сучасным этапе.

Для найбольш поўнага задавальнення навуковых і інфармацыйных запатрабаванняў чытачоў важнае значэнне мае забеспячэнне паўнаты фарміравання і захаванне газетных фондаў. З мэтай папаўнення калекцый нашых газет супрацоўнікамі аддзела была праведзена работа па даследаванні фондаў раённых газет даваеннага і ваеннага перыядаў Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі. Вынікі даследавання паказалі, што шэраг выданняў, такіх, як “Калгасны сцяг” Чавускага раёна, “Сталінская праўда” Веткаўскага раёна, “Сталінскі прызыў” Касцюковіцкага раёна і іншыя адсутнічаюць у нашых фондах. Колькасны састаў такіх лакун складае 40 назваў. Фонды раённых газет Нацыянальнага архіва захоўваюць толькі асобныя разрозненыя нумары газет. Перад намі стаіць задача атрымаць гэтыя выданні шляхам мікрафільмавання, бо кожнае папаўненне фондаў даваеннымі выданнямі, якія адсутнічаюць у бібліятэках, з’яўляецца важнай падзеяй у працэсе вяртання і захавання нацыянальнай спадчыны.

Найбольш поўныя камплекты раённых выданняў сабраны за пасляваенны і сучасны перыяды. Значная роля па ліквідацыі лакун і папаўненні фонду гэтага перыяду належыць прыватным асобам. У апошнія гады ў фонды НББ карыстальнікамі было перададзена каля 25 калекцый раённых газет за 50–90-я гг., сярод іх “Ударнік Дзяржыншчыны” Дзяржынскага раёна, “Бальшавік Барысаўшчыны” Барысаўскага раёна, “Ленінскі прызыў” Аршанскага раёна і іншыя.

Штогод фонд раённых газет папаўняецца двума бясплатнымі экзэмплярамі.

Фонд раённых газет поўна адлюстраваны ў СБА аддзела. Асобным радам выдзелены раённыя газеты у ручным і электронным алфавітным каталогах.

У сувязі са змяненнем гістарычных падзей назвы раённых газет таксама змяняліся. Няцяжка заўважыць, што раённыя выданні пэўнага перыяду мелі аднолькавыя назвы, што з’явілася штуршком для асаблівай расстаноўкі раённых газет. Яна заключаецца ў тым, што газеты размешчаны не па назвах выданняў, а па назвах раёнаў, дзе яны выдаваліся. Шматгадовы вопыт паказаў, што гэта дало магчымасць у поўнай меры задаволіць запыты

карыстальнікаў і дасканала раскрыць фонд раённых газет у цэлым, дапамагло прасачыць выдавецкую гісторыю кожнага раённага цэнтра.

У якой бы якасці не выступала НББ – у традыцыйнай або новай – яе асноўная функцыя як інфармацыйнага цэнтра – збіраць і захоўваць дакументы, інфармацыю не толькі для прадастаўлення карыстальнікам, але і прапагандаваць яе ў часе і прасторы. Таму захаванасць нашага фонду з'яўляецца прадметам пільнай увагі і ўяўляе комплекс глабальных задач, ад вырашэння якіх залежыць даступнасць грамадству інфармацыі, ідэй, ведаў. Сёння магчымасці нашай бібліятэкі, як ніколі раней, дазваляюць захоўваць гэтыя выданні ў належных умовах. У перыяд асваення новага будынка супрацоўнікамі аддзела было добра распрацавана планаванне размяшчэння фонду на стэлажах. Гэта дае магчымасць з найменшай затратай сіл аблегчыць работу бібліятэкараў і садзейнічае захаванню фонду. Раённыя газеты размешчаны на 7 паверсе, на 1236 метрапаліцах, па 2 пераплётныя адзінкі на паліцы. Пасля кожнай назвы астаўлены запас метрапаліц на некалькі гадоў.

Маё даследаванне фонду раённых газет паказала, што самай важнай праблемай на сучасным этапе з'яўляецца перанос страхавога фонду раённых газет на мікраносьбіты. У мэтах забеспячэння захаванасці найбольш каштоўных выданняў даваеннага і ваеннага перыядаў патрэбна дапоўніць фонды перыёдыкі электроннымі дакументамі за гэтыя гады. Камплектаванне 2-х экзэмпляраў бягучых газет дае магчымасць алічбоўваць другі рассыпны экзэмпляр. Алічбаванне забяспечыць даступнасць газет праз Інтэрнэт і тым самым дасць магчымасць стварыць магутны пошукавы апарат. Вырашэнне гэтых праблем забяспечыць захаванасць фондаў раённых газет на доўгія гады і зробіць іх больш даступнымі да карыстальніка.